# *ДА 55-ГОДДЗЯ ПЯТРА ЯРАСЛАВАВІЧА СЯМІНСКАГА*



Дарагі Пётр Яраслававіч!

Вы сустракаеце свой прамежкавы юбілей верным свайму амплуа руплівага працаўніка, шчырага, адданага сябра, сумленнага і прыстойнага чалавека. З запалам нястомнага асветніка-патрыёта Вы, не шкадуючы сіл, гатовы бараніць святасць духоўных каштоўнасцяў і веліч непарушных ідэалаў. Гістарычная несправядлівасць бачыцца Вам прадметам гарачай ідэйнай барацьбы; недасканаласці свету – нагодай для глыбокага творчага пераасэнсавання. Вы з тых літаратараў, для якіх занятак літаратурай стаў не проста творчасцю, а пошукам найкароткіх шляхоў да роднасных душ. І, дзякуй богу, пошук гэты ўвянчаўся чаканым вынікам. Сардэчна віншуем Вас з 55-годдзем, жадаем Вам і надалей крочыць сваім шляхам у жыцці і літаратуры, не паслабляць хватку, не губляць вернасці сабе, а Вашай рамантычнай натуры – захаваць гэтую непасрэднасць ідэаліста і сентыментальны імпэт рыцара. Здароўя і сямейнага дабрабыту Вам, натхнення, гармоніі, душэўнай раўнавагі і дасягнення ўсіх мэтаў, якія ставіць перад Вамі жыццё. З юбілеем!

*Калектыў*
*Гродзенскага абласнога аддзялення*
*Саюза пісьменнікаў Беларусі*

29 мая 2018 года